**Марцынкевіч, Р.** «Мы ваявалі не за ўзнагароды, мы выконвалі свой абавязак» / Р. Марцынкевіч // Веснік Глыбоччыны. — 2005. — 12 лют. — С. 1–2.

**«МЫ ВАЯВАЛІ НЕ ЗА ЎЗНАГАРОДЫ, МЫ ВЫКОНВАЛІ СВОЙ АБАВЯЗАК»**

**Няўмольна бяжыць час. 16 год аддзяляюць нас ад памятнага лютага 1989 года, калі апошнія часці абмежаванага кантынгенту савецкіх войск былі выведзены з Афганістана. Падраслі ўжо дзеці тых, хто выконваў у далёкай усходняй краіне свой грамадзянскі абавязак.**



Па-рознаму цяпер ацэньваюць удзел савецкіх войск у грамадзянскай вайне ў Афганістане. Але гісторыю не перапішаш нанава. Больш 300 тысяч беларускіх юнакоў у складзе абмежаванага кантынгенту прайшлі праз гарніла той вайны. Каля тысячы афганцаў сталі інвалідамі, 877 юнакоў вярнуліся дадому рэйсамі «чорнага цюльпана». Час лечыць раны, загойвае псіхалагічныя траўмы. Але колькі б ні прайшло гадоў, будзе жыць памяць аб тых страшэнных выпрабаваннях, якія выпалі на долю 18-гадовых юнакоў. Іх называюць ветэранамі вайны. Неяк не стасуецца гэта з узростам афганцаў, бо многім толькі крыху больш сарака. А кавалеру ордэна Чырвонай Зоркі Уладзіміру Ліпчыку і таго менш. Нядаўна ён адзначыў 35-годдзе.

Валодзя – глыбачанін, закончыў трэцюю гарадскую школу. У армію яго прызвалі ў 1987 годзе з Наваполацка (вучыўся ў вучылішчы нафтавікоў). Ужо сем гадоў у Афганістане ішла вайна, і ніхто не мог сказаць, калі ж закончыцца гэтае пекла. На змену загартаваным у баях салдатам на чужую зямлю закідвалі маладзенькіх хлопцаў, якія ледзь навучыліся трымаць у руках зброю.

Стаяў спякотны жнівень, калі мотаманеўровая група, у якой быў Уладзімір, высадзілася пад афганскім горадам Герат. Шэрасць пустыні і непрыступнасць халодных суровых гор не сапсавалі настрой салдат. Жартавалі, пасмейваліся адзін над адным, нібыта і не на вайне. Яны не хацелі думаць аб тым, што чакае наперадзе. А чакала іх цяжкая салдацкая ноша, хваробы, страта сяброў. Літаральна на кожным кроку глядзела ў вочы смерць.

У Юліі Друнінай ёсць такія радкі: «Кто говорит, что на войне не страшно, тот ничего не знает о войне».

– Ты згодны з гэтымі словамі? – пытаюся ў Валодзі.

– Нам у тую пару было па 18 – 19 год. Магчыма вы не паверыце, але страху мы не адчувалі. Напэўна, дапамагаў юнацкі максімалізм, рызыка. Цяпер, з вышыні пражытых гадоў, тыя падзеі ўспрымаюцца зусім па-іншаму, – шчыра прызнаецца воін-інтэрнацыяналіст.

У пісьмах дадому Валодзя пісаў, што ў яго ўсё добра, служба ідзе сваім парадкам, прасіў не хвалявацца.

– А я кожны ліст чакала з вялікай трывогай, – успамінае маці Уладзіміра Зінаіда Пятроўна. – Каб не наклікаць бяду, нават думкі не дапускала, што з сынам можа што-небудзь здарыцца.

Але бяда не абмінула дом Ліпчыкаў. Ранняй вясной 1988 года ў баі Валодзя быў цяжка паранены. (За той бой ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі).Тады загінулі некалькі яго

сяброў, а Уладзіміра даставілі ў ваенны шпіталь у Ашхабадзе. Спатрэбіліся чатыры месяцы, каб залячыць асколачнае раненне. Толькі стаўшы бацькам, Валодзя зразумее, колькі паражылі за гэты час яго родныя.

У шпіталі Уладзімір пазнаёміўся з Ольгай. Пазней, калі часці Савецкай Арміі будуць выведзены з Афганістана, яна стане яго жонкай.

– Два гады мы жылі ў Ашхабадзе. Там нарадзіўся наш сын. Мне падабаўся той горад. Але з развалам Савецкага Саюза там многае змянілася, і мы пераехалі ў Беларусь, у Глыбокае, да маіх бацькоў, – распавядае Уладзімір.

У першыя гады па вяртанні з Афгана вайна часта трывожыла яго сон. Ён знемагаў пад спякотным афганскім сонцам, бачыў шпітальныя палаты, падхопліваўся сярод ночы ад разрываў снарадаў... Але нішто так не лечыць, як час, спакойная дамашняя абстаноўка. Прытупіўся боль афганскай вайны і ва Уладзіміра Ліпчыка. Пра сваё гераічнае юнацтва ён не любіць успамінаць. Кажа:

– Нас паслала Айчына абараняць дзяржаўныя інтарэсы. І ваявалі мы не за ўзнагароды, мы выконвалі свой абавязак. Гэта была сапраўдная школа мужнасці. Але не дай Бог, каб на падобных уроках вучыўся мой сын.

...Паслязаўтра – чарговая гадавіна вываду савецкіх войск з Афганістана. Па традыцыі кавалер ордэна Чырвонай Зоркі Уладзімір Ліпчык падыме келіх віна за жывых і мёртвых, за тых, хто вярнуўся, і за тых, хто навечна застаўся ў гарах Афганістана, за тых, хто выканаў свой абавязак перад Радзімай, за сапраўдных мужчын.

**Рэгіна МАРЦЫНКЕВІЧ**

**НА ЗДЫМКУ: Уладзімір Ліпчык**